Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома

Год выдання другі.

№ 71 (140)
СЕРАДА
27
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

НОВАЯ ПЕРАМОГА СТАЛІНСКАГА БЛОКА

Прайшло крыху больш паўгода з таго часу, як наша доблесная Чырвоная Армія перайшла граніцу былой панскай Польшчы і вызваліла Заходнюю Украіну і Заходнюю Беларусь ад векавых прыгнятальнікаў. Кожны дзень гэтых шасці месяцаў для мільёнаў працоўных Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі раўняецца годам па багаццю і яркасці перажыванняў. Гэтыя шэсць месяцаў унеслі столькі змяненняў у жыццё працоўных вызваленых абласцей, што непазнавальнымі сталі гэтыя абласці. Там, дзе панавалі любамірскія, патоцкія, радзівілы, сапегі, тышкевічы і ім падобныя эксплаататары і паразіты, там, дзе гаспадарылі незадачлівыя бекі і рыдз-сміглы, — там устанавілася ўлада Советаў.

Зямля стала народным здабыткам, сотні тысяч батракоў, беззямельных і малазямельных сялян атрымалі зямлю, атрымалі інвентар для апрацоўкі зямлі, кароў і коней. Фабрыкі і заводы сталі народным здабыткам, дакладна таксама, як народным здабыткам сталі банкі. Ліквідуецца беспрацоўе. Дзесяткі тысяч рабочых і служачых, якія на працягу многіх год былі беспрацоўнымі, цяпер заняты работай не на эксплаататараў, а на сябе, на родную совецкую дзяржаву. Сотні школ адкрыліся ў Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі, і родная мова — украінская, беларуская, польская, яўрэйская свабодна гучыць у школе і на народных сходах.

Яшчэ толькі паўгода прайшло свабоднага жыцця, а адусюль ужо прабіваецца магутны парастак новай, совецкай культуры. І да гэтай культуры цягнуцца тысячы, сотні тысяч людзей яшчэ нядаўна задаўленых, палітычна бяспраўных людзей. Усюды кіпіць творчая работа. Будуюцца новыя фабрыкі і заводы, будуецца Днепра-Бугскі канал, аднаўляецца Днепра-Нёманскі канал.

Велізарныя масы сялянства пачынаюць у літаральным значэнні новую вясну свайго жыцця — першую совецкую вясну. Перадавыя сяляне арганізавалі ўжо, па свайму ўласнаму пачыну, першыя дзесяткі калгасаў. Такія ў самых агульных рысах тыя змяненні, якія адбыліся за паўгода ў заходніх абласцях Украіны і Беларусі.

Глыбока ўвайшлі ў жыццё працоўных мас Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі ідэі совецкай улады, масы працоўных успрынялі совецкую ўладу, як сваю родную. Толькі што закончыўшыяся выбары ў Вярхоўныя Советы Саюза ССР, УССР і БССР паказалі велізарны ўплыў комуністычнай партыі. Працоўныя масы і гэтых абласцей ведаюць, што вялікая партыя Леніна—Сталіна забяспечыла сваім кіраўніцтвам народам Совецкага Саюза велізарнейшыя гістарычныя перамогі.

ВА ЎСІХ ВЫБАРЧЫХ АКРУГАХ ЗАХОДНІХ АБЛАСЦЕЙ УКРАІНСКАЙ ССР І БЕЛАРУСКАЙ ССР ДЭПУТАТАМІ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ВЫБРАНЫ КАНДЫДАТЫ БЛОКА КОМУНІСТАЎ І БЕСПАРТЫЙНЫХ, ПРЫЧЫМ У ВЫБАРАХ ПРЫНЯЛА ЎДЗЕЛ 96 І БОЛЬШ ПРОЦАНТАЎ АД АГУЛЬНАЙ КОЛЬКАСЦІ ВЫБАРШЧЫКАЎ. Гэты бліскучы поспех з'яўляецца сведчаннем велізарнай палітычнай актыўнасці мас і рэзультатам той вялікай работы, якая выканана была органамі совецкай улады і комуністычнай партыяй за гэты кароткі тэрмін. Працоўныя масы ведаюць, што комуністычная партыя дапамагла ім за паўгода прайсці шлях дзесяцігоддзяў. І яны аднадушна галасавалі за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, не гледзячы на варожую агітацыю астаткаў паразітычных элементаў у гэтых абласцях.

Працоўныя масы заходніх абласцей УССР і БССР за шэсць месяцаў прайшлі велізарную палітычную школу. Глыбейшыя змяненні, якія адбыліся ў жыцці гэтых мас, дапамаглі і самым адсталым пераканацца ў тым, што совецкая ўлада і комуністычная партыя з'яўляюцца сіламі, якія нясуць росквіт народнага жыцця ва ўсіх галінах. Да дня выбараў масы падышлі арганізавана. Велізарная прапагандысцкая і агітацыйная работа, выкананная ў перадвыбарчы перыяд, дапамагла масам разабрацца ў разнастайных пытаннях, якія сталі перад імі, вывучыць Сталінскую Канстытуцыю, зразумець яе велізарнае значэнне, вылучыць дастойных людзей — сваіх сыноў і дачок у вярхоўныя органы совецкай улады.

Народы Совецкага Саюза ведаюць ужо многіх дэпутатаў, выбраных у заходніх абласцях Украіны і Беларусі ўсенародным галасаваннем 24 сакавіка. Гэта не графы, не князі, не капіталісты, не ксяндзы, не кулакі, як гэта было заўсёды на выбарах у панскай Польшчы. Не, гэта самыя адданыя справе народаў рабочыя, сяляне, гэта лепшыя прадстаўнікі народнай інтэлігенцыі. Народы СССР аднолькава маюць давер'е і да ўкраінцаў, і да беларусаў, і да палякаў, і да яўрэяў, выбраных народамі заходніх абласцей Украіны і Беларусі. Яны ведаюць і справіліся палюбіць гэтых людзей. Яны яшчэ не бачылі на трыбуне Вярхоўнага Совета СССР, але ўжо ведаюць Ванду Васілеўскую, якая расказала ў сваіх кнігах «Зямля ў ярме», «Радзіма» і іншых аб пакутах польскага народа. Яе ведаюць мільёны рабочых, калгаснікаў, чырвонаармейцаў, совецкай інтэлігенцыі нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

У Вярхоўным Совеце СССР будзе гучаць голас Філіпа Сямёнавіча Пестрака, які заплаціў гадамі турмы за сваю любоў да роднага народа, за адданасць да комуністычнай партыі. Ён быў адным з першых, хто дапамог Чырвонай Арміі і совецкай уладзе ў справе вызвалення народаў Заходняй Беларусі. Вось Софія Несцераўна Юхімчук, былая батрачка, для якой, як і для соцень тысяч такіх як яна, з прыходам совецкай улады пачалося новае, поўнае глыбокага сэнсу і радасці жыццё. Вось акадэмік Студзінскі, беспартыйны вучоны, які з прыходам совецкай улады аддаўся будаўніцтву новай, совецкай культуры, а радам з ім маладая сялянка Марыя Аляксееўна Перапеліца і чыгуначны рабочы Васіль Грыгор'евіч Садовы. Вось вылучаны нафтавікамі Барыслава Іван Паўлавіч Шчэпанік, які ўсім сваім жыццём даказаў адданасць рабочаму класу. Вось слесар з Брэста Дзімітрый Іванавіч Саўчык і радам з ім акадэмік Панчышын.

Нядаўна яшчэ палітзняволены польскага турэмнага засценка Сяргей Осіпавіч Прытыцкі, цяпер намеснік старшыні Беластоцкага аблвыканкома. Усе памятуюць палкую прамову сялянкі з сяла Стаднікі Ульяны Васільеўны Ефімчук - Дз'ячук на сесіі Вярхоўнага Совета СССР. Такіх людзей — верных сыноў і дачок народа — выбралі працоўныя заходніх абласцей Украіны і Беларусі ў Совет Саюза і Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўныя Советы Украіны і Беларусі.

29 сакавіка адкрыецца VI сесія Вярхоўнага Совета СССР. Пяцьдзесят пяць кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, выбраных усенародным галасаваннем у заходніх абласцях Украіны і Беларусі дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР, уступяць у Крэмлёўскі палац і прымуць удзел у работах вярхоўнага органа ўлады. Яны ўвойдуць у сям'ю выбраннікаў народаў СССР, як прадстаўнікі мільёнаў свабодных совецкіх людзей, яшчэ паўгода таму назад знаходзіўшыхся пад пятой прыгнятальнікаў.

Выбары ў вярхоўныя органы совецкай улады прайшлі ў вызваленых заходніх абласцях Украіны і Беларусі як вялікае народнае свята. З гэтага часу ў гэтых абласцях яшчэ ярчэй, яшчэ хутчэй і паўней будуць развівацца і расцвітаць усе творчыя сілы народа, распрыгоненага совецкай уладай для будаўніцтва комуністычнага грамадства. Народы Совецкага Саюза вітаюць выбраннікаў трынаццаці мільёнаў новых поўнаправўных грамадзян нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

(Перадавы артыкул «Праўды» ад 26 сакавіка, прыняты па радыё).

Папярэднія даныя аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР

Ад выбарчых акруг заходніх абласцей Украінскай ССР і Беларускай ССР

Згодна паведамленняў, паступіўшых у сакратарыят Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад акруговых выбарчых камісій па выбарах у Вярхоўны Совет СССР, у заходніх абласцях Украінскай ССР і Беларускай ССР 24 сакавіка 1940 года адбыліся выбары ва ўсіх 43 выбарчых акругах па выбарах у Совет Саюза і ва ўсіх 12 выбарчых акругах па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

Выбары пачаліся ў 6 гадзін раніцы ва ўсіх гарадах, сёлах і пасёлках заходніх абласцей Украіны і Беларусі, і ўсюды да 4 гадзін дня 24 сакавіка прагаласавала велізарная большасць выбаршчыкаў. У 12 гадзін ночы 24 сакавіка галасаванне закончылася.

Згодна папярэдніх даных акруговых выбарчых камісій, у заходніх абласцях Украінскай ССР і ў заходніх абласцях Беларускай ССР у выбарах прыняла ўдзел 96 і больш процантаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Ва ўсіх выбарчых акругах заходніх абласцей Украінскай ССР і Беларускай ССР дэпутатамі Вярхоўнага Совета СССР выбраны кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных. (БЕЛТА)

Папярэднія даныя аб выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР

ад Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцей

Па паведамленнях, якія паступілі ў сакратарыят Прэзідыума Вярхоўнага Совета Беларускай ССР ад Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцей 24 сакавіка 1940 года адбыліся выбары ва ўсіх 2[..] выбарчых акругах па выбарах у Вярхоўны Совет Беларускай ССР.

Насельніцтва паказала велізарную актыўнасць і арганізаванасць.

Выбары пачаліся ў 6 гадзін раніцы і да 4 гадзін дня 24 сакавіка па ўсіх гарадах, сёлах і пасёлках заходніх абласцей Беларусі прагаласавала велізарная большасць выбаршчыкаў.

У 12 гадзін ночы 24 сакавіка галасаванне закончылася.

Участковыя і акруговыя выбарчыя камісіі прыступілі да падліку вынікаў галасавання.

Па папярэдніх даных акруговых выбарчых камісій у заходніх абласцях Беларускай ССР у выбарах прыняла ўдзел 96 і больш процантаў ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Ва ўсіх выбарчых акругах заходніх абласцей Беларускай ССР дэпутатамі Вярхоўнага Совета Беларускай ССР выбраны кандыдаты блока комуністаў і беспартыйных.

(БЕЛТА).

УРУЧЭННЕ МАНДАТАЎ ДЭПУТАТАМ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР і БССР.

Закончыўся падлік галасоў. Участковыя акруговыя выбарчыя камісіі ўручылі мандаты пасланцам ў Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Мандаты атрымалі дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР тт. Філіп Сямёнавіч Пестрак (Гродненская выбарчая акруга № 600), Іван Антонавіч Турлейскі (Беластоцкая выбарчая акруга № 581), Сяргей Осіпавіч Прытыцкі (Гродненская выбарчая акруга № 582) і інш.

Сёння заканчваецца выдача мандатаў дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР.

ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР ВЫЕХАЛІ Ў МАСКВУ НА VI СЕСІЮ

Працоўныя Беластоцкай абласці 24 сакавіка выбралі сваімі дэпутатамі ў Вярхоўны Совет СССР камандуючага Беларускай Асобай Ваеннай Акругай тав. **Кавалёва,** намесніка старшыні аблвыканкома тав. Прытыцкага, работніцу-тэкстыльшчыцу тав. **Дзьячук,** сакратара абкома партыі тав. **Ігаева,** селяніна Ваўкавыскага раёна тав. **Сеўко,** паэта **Пестрака** і тэхнарука Ломжынскага завода сельгасмашын тав. **Турлейскага.**

Учора ў 6 гадзін 15 мінут у спецыяльным вагоне дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР ад Беластоцкай абласці выехалі ў Маскву на VI Сесію Вярхоўнага Совета СССР, якая адкрываецца 29 сакавіка.

ПЕРШЫЯ СЛОВЫ ПАДЗЯКІ — ВЯЛІКАМУ СТАЛІНУ

(Гутарка з дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкім С. О.)

Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкі ў гутарцы з нашым супрацоўнікам сказаў:

— Паведамленне аб выбранні мяне дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР і ўручэнне акруговай выбарчай камісіяй дэпутацкага дакумента вельмі ўзрадавалі мяне, узнялі маю энергію на небывалую вышыню.

Ды як не радавацца? Былы пастух і парабак, які ўсё сваё жыццё цярпеў пакуты здзекі, былы палітзняволены, [...]важды прыгавораны польскім [...]дом да смяротнага пакарання, выбран воляй народа дэпутатам Вярхоўнага Совета Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Мне даверана па[...]ная работа—разам з іншымі дэпутатамі, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вырашаць важнейшыя пытанні жыцця вызваленага народа.

Зараз я ў другі раз выязджаю ў Маскву. Буду зноў у Крэмлі, зноў убачу нашага роднага таварыша Сталіна.

Хіба-ж можа быць большае шчасце!

У адказ на давер'е народа я з першымі словамі найвялікшай падзякі звяртаюся да таго, хто бачыць кожнага прыгнечанага, у якім-бы кутку света ён ні быў, да таго, хто ўсё сваё жыццё прысвяціў вызваленню прыгнечаных народаў, — да вялікага роднага бацькі таварыша Сталіна. Партыі Леніна—Сталіна і народу я аддам ўсе свае сілы, усё сваё жыццё.

У Наркамаце Замежных Спраў

19 сакавіка французскі паверанны ў справах у Маскве Пайяр паведаміў Народнаму Камісару Замежных Спраў тав. [...]атаву, што ўрад Францыі лічыць [п]ераданую на тэлеграф і падпісаную совецкім паўпрэдам у Парыжы [та]в. Сурыцам тэлеграму ў Маскву [на] імя таварыша Сталіна з пры[чы]ны заключэння Мірнага Дагавора СССР з Фінляндыяй умяшаннем паўпрэда ва ўнутранае палітычнае жыццё Францыі. Пры гэтым, [па] паведамленню п. Пайяра, французскі ўрад лічыць некарэктным у адносінах французскага ўрада паў[пр]эда выразы падпісанай паўпрэдам тэлеграмы, падкрэсленыя ў прыведзеных ніжэй вытрымках з тэлеграмы, а іменна: «Дзякуючы мудрасці совецкага ўрада і нашай [до]блеснай Чырвонай Арміі, **планы англа-французскіх падпальшчыкаў [в]айны,** якія стараліся распаліць [пож]ар вайны на паўночным усходзе Еўропы, зноў пацярпелі няўдачу, а такасама «Совецкі Саюз ас[тае]цца непрыступнай крэпасцю, аб [якую] ў будучым разаб'юцца **цёмныя замыслы ворагаў соцыялізма** і працоўных усяго свету». Хаця пасылка гэтай тэлеграмы не была дапушчана цэнзурай, французскі ўрад заявіў, што Сурыц больш не будзе лічыцца французскім урадам „persona grata“ і выразіў пажаданне аб адкліканні тав. Сурыца совецкім урадам.

У сувязі з гэтым намеснік Наркома па замежных справах тав. Лазоўскі перадаў п. Пайяру 26 сакавіка наступны адказ совецкага урада:

«1. Урад СССР не знаходзіць па сутнасці падстаў для таго, каб французскі ўрад не мог больш лічыць совецкага паўпрэда п. Сурыца „persona grata“ на падставе зместа падпісанай п. Сурыцам для адпраўкі ў Маскву тэлеграмы, у якой нават не ўпамінаецца аб французскім урадзе.

2. Паколькі, аднак, французскі ўрад ставіць у адносінах Сурыца фармальнае пытанне аб давер'і, урад СССР паведамляе, што п. Сурыц вызваляецца ад абавязкаў паўпрэда СССР ва Францыі».

БУДУ ДАСТОЙНЫМ СЫНАМ ВЫЗВАЛЕНАГА НАРОДА

(Гутарка з дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР тав. Пестраком Ф. С.)

Добра ўсім вядомы сын вызваленага народа тав. Пестрак атрымаў мандат дэпутата Вярхоўнага Совета СССР. У сувязі з гэтым ён паведаміў супрацоўніку нашай газеты:

—Я прасядзеў у польскай турме 11 год. Паны здзекаваліся нада мной, як маглі. Але я не падаў духам. Будучы знаёмым з марксізмам-ленінізмам, быў упэўнен, што вызваленне для нас прыйдзе абавязкова. Зараз тая ўпэўненасць ператварылася ў сапраўднасць. Вялікая партыя Леніна—Сталіна, совецкі народ і яго доблесная Чырвоная Армія назаўсёды вызвалілі нас ад невыноснага прыгнёту.

Сваім становішчам, хоць гэта было выключна цяжка, я бязмежна задаволен. Прайшоўшы незлічоныя няўзгоды, больш прыемна бачыць і тварыць новае жыццё.

Тое жыццё, аб якім мы гадамі толькі марылі, зараз практычна будуем пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, пры дапамозе шчаслівага совецкага народа. Ужо многае зроблена за прайшоўшыя шэсць месяцаў. Усе працоўныя вызваленых заходніх абласцей Беларусі сталі роўнаправўнымі грамадзянамі. Адкрываюцца ўсё новыя і новыя школы. Будуюцца клубы, тэатры, бальніцы і г. д.

Вызвалены народ ацаніў маю барацьбу супроць польскіх паноў, выбраўшы мяне дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР. Абяцаю апраўдаць давер'е народа, быць дастойным сынам вызваленых працоўных, дастойным сынам вялікай соцыялістычнай радзімы.

У сваёй дэпутацкай рабоце да ўсіх пытанняў буду адносіцца так, як вучыць нас таварыш Сталін. Да канца свайго жыцця буду самаадданна змагацца за ўмацаванне і расшырэнне тых заваёў, таго шчасця, якое нам дала комуністычная партыя, якое нам даў вялікі Сталін. Буду змагацца, каб вызвалены народ заходніх абласцей Беларусі хутчэй дабіўся тых-жа поспехаў, якія маюць народы ўсходніх абласцей БССР.

ДАВЕР'Е ВЫБАРШЧЫКАЎ АПРАЎДАЮ З ЧЭСЦЮ

(Гутарка з дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР тав. Турлейскім І. А.)

У гутарцы з нашым супрацоўнікам дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Турлейскі расказаў аб наступным:

— Я атрымаў мандат аб выбранні мяне дэпутатам Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР. Якое шчасце! Проста не хапае слоў, каб выказаць сваю бязмерную ўдзячнасць народу за аказанае давер'е.

Вынікі выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР ад заходніх абласцей Беларусі ўсяму свету паказалі, што вызвалены народ яшчэ раз прагаласаваў за совецкую ўладу, за партыю Леніна—Сталіна. Назаўсёды будзе свяціць нам яснае сонца Сталінскай Канстытуцыі!

Стаўшы дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР, я яшчэ раз абяцаю быць да канца адданым нашай соцыялістычнай радзіме, быць верным нашай мудрай большэвіцкай партыі і яе вялікаму правадыру любімаму Сталіну. Усё жыццё, да апошняга ўздыху, буду чэсна, добрасумленна служыць працоўнаму народу. Буду рашуча змагацца супраць ворагаў народа, змагацца за хутчэйшую пербудову жыцця вызваленых працоўных — беларусаў, яўрэяў і палякаў.

ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У БЕЛАСТОКУ

НА ЎЧАСТКАХ СОВЕЦКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

Палова шостага. Ноч. — На вуліцах стаіць серабрысты туман. Пры святле электрычных ліхтароў хутка рухаюцца людзі. Адчуваецца радасны настрой.

На 79 участку Совецкай выбарчай акругі сабралося многа людзей. У 4 гадзіны 45 мінут прышла беларуска Браніслава Бакавая, каб першай аддаць свой голас за лепшых сыноў працоўнага народа. Другой апусціла бюлетэнь у ўрну тэкстыльшчыца тав. Штэйн.

— Мне ўжо 64 годы,—гаварыць тав. Штэйн, — 45 год я працавала на эксплаататараў, многа год была беспрацоўнай. Толькі зараз я атрымала сталую работу на 4-м тэкстыльным камбінаце.

Да стала выбарчай камісіі падыходзіць сляпы старык Муроўскі Ізыдар, якога вядзе жонка. Нейкай асабліва ўрачыстай паходкай ён набліжаецца да ўрны, дрыжачымі рукамі шукае шчыліну і апускае ў яе бюлетэні.

— Я быў калісьці ў Расіі,—гаворыць Муроўскі,—там мой сын, рабочы, прымаў актыўны ўдзел у рэволюцыі. Я-б на каленях пайшоў туды, дзе совецкая краіна, але яна прышла да нас.

9 гадзін раніцы. На 80 выбарчы ўчастак прышлі галасаваць цэлымі сем'ямі. — Нас прышло сем чалавек, — гаворыць тав. Хжаноўскі Адам, і ўся мая сям'я з радасцю аддасць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

На ўчастак прышоў галасаваць кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Машэвіцкі.

— За радзіму, за Сталіна!— заяўляе тав. Машэвіцкі, апускаючы бюлетэнь у ўрну. — Я перажываю выключна шчаслівыя мінуты. Якое вялікае шчасце разам з вызваленым народам галасаваць за нашу неабсяжную радзіму, за комуністычную партыю, за таварыша Сталіна. У апошнюю ноч з 23 на 24 сакавіка неяк не спалася. Адчуваю, быццам-бы памаладзеў, б'е новая, свежая сіла. Гэту сілу і прыток новай энергіі аддам на справу працоўных.

На 80 участку да двух гадзін дня аддалі свае галасы 725 чалавек.

10 гадзін 45 мінут. У памяшканне 81 выбарчага ўчастка плаўна цячэ паток выбаршчыкаў. Задоўга перад пачаткам галасавання арганізавана прышлі на ўчастак 60 студэнтаў педінстытута.

Агітатар Ліўшыц расказвае:— З маіх 80 выбаршчыкаў 63 ужо прагаласавалі. Нас прымаюць ветліва, — дадае агітатар тав. Гефан. 83-гадовая хатняя гаспадыня, полька, Рафалоўская, да якой прынеслі ўрну на кватэру, заявіла: — Пры польскай уладзе я галадала. Зараз я атрымліваю дзяржаўную дапамогу. Добрыя людзі кіруюць нашай краінай.

З пяці дамоў па Ленінскай вуліцы, дзе агітатарам працуе тав. Назараў, арганізавана, у колькасці 300 чалавек, са сцягамі і аркестрам прайшлі праз некалькі вуліц, а потым накіраваліся на 74 выбарчы ўчастак, каб аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і і беспартыйных.

У 2 гадзіны дня мы зноў на 79 участку. Жыва і арганізавана ідзе тут работа. Да двух гадзін прагаласавала 1.016 выбаршчыкаў. Падыходзяць апошнія выбаршчыкі. Сярод іх маладая выбаршчыца Дунаеўская, якую не ўнеслі ў спісак, бо лічылі яе няпоўнагадовай. Усхваляваным голасам яна даказвае, што ёй ўжо ў снежні 1939 года споўнілася 18 год і ўпэўнена просіць, каб ёй дазволілі галасаваць. Яе просьбу прымаюць пад увагу. Да 9 гадзін вечара на 79 участку прагаласавала 100 процантаў выбаршчыкаў.

У акруговую камісію Совецкай выбарчай акругі перадаюць лічбы аб удзеле ў галасаванні. Да 6 гадзін вечара прагаласавала ўжо 13.314 чалавек, што складае 91,3 процанта ўсіх выбаршчыкаў. Да канца дня гэта лічба ўзнімаецца да 99,6 проц.

Вячэрнія змрокі апусціліся над Беластокам. Усюды гараць сотні ліхтароў. Працоўныя Совецкай выбарчай акругі, як і ўсяго Беластока, перажылі гістарычны дзень.

С. А. Натансон

ВЯЛІКАЯ ПЕРАМОГА

СЯМ'Я КУСТЫНА ГАЛАСУЕ

Ісаку Лейбавічу Кустыну 79 год. На ўчастак № 66 ён рышоў з усёй сям'ей: 75-гадовая жонка Хая Абрамаўна, 2.-гадовы сын Іосіф, дачка Сон са сваім мужам Ізраілем Скальнікам. Яны з'явіліся на ўчастак у палове шостай, каб галасаваць першымі.

Ісак Лейбавіч беражна, як каштоўныя рэчы, бярэ бюлетэні і ідзе ў пакой для галасавання.

Члены сям'і Кустына заходзяць адзін за другім у кабінкі, выходзяць са складзенымі бюлетэнямі, падыходзяць да ўрны.

— За наша шчасце, — гаворыць Хая Абрамаўна, апускаючы бюлетэні.

ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Фаня Гелер 8 сакавіка атрымала совецкі пашпарт. 23 сакавіка яна з'явілася на 66 выбарчы ўчастак і пачала ўважла правяраць спісак выбаршчыкаў.

— Ёсць!—радасна ўсклікнула яна, знайшоўшы ў спісе сваё прозвішча і імя.

— Так-жа і павінна быць,- звяртаецца да яе дзяжурны член камісіі.

— Вы мяне не зразумелі, — хвалюючыся адказвае Фаня.— Бачыце, заўтра мой дзень нараджэння і мне толькі спаўняецца 18 год. Маглі і не запісаць у спісак. Але-ж запісалі. Я так рада, не магу нават выказаць свае пачуцці.

У 6 гадзін раніцы 24 сакавіка Фаня на ўчастку. Яна нясмела падыходзіць да сакратара і ўсхвалявана гаворыць:

— Калі ласка, дайце мне бюлетэні. Я жыву па Совецкай вуліцы, 44.

Сакратар правярае спісак, робіць адзнаку і выдае бюлетэні. Фаня беражна бярэ іх і ідзе да кабінкі. Каля ўрны яна спыняецца і гаворыць членам камісіі:

Сёння мой дзень нараджэння. ...кі шчаслівы дзень!

АПОШНЯЯ СОТНЯ

6 гадзін 30 мінут вечара. Толькі 100 выбаршчыкаў не з'явілася яшчэ на галасаванне ў 66 участку. Даверааны ўчастка тав. Шумілінскі хвалюецца. Ён даведаўся, што ў некаторых участках галасаванне амаль закончылася.

Па адным, па два ідуць апошнія выбаршчыкі. Асталося 50 чалавек, потым 45, потым яшчэ менш. Усё змяншаецца лічба непрагаласаваўшых. Скора галасаванне закончыцца.

З радыёрупараў разносіцца бой гадзінніка з Крэмлёўскай вежы. Прабіла 12 гадзін. Чуваць знаёмая ўсяму свету мелодыя пролетарскага гімна.

Галасаванне закончана. У памяшканні ўчастка астаюцца толькі члены камісіі. Старшыня камісіі т. Шмідт знімае пячатку з урны і на стол высыпаюцца бюлетэні. Начынаецца падлік галасоў. Бюлетэняў з выкрасленымі прозвішчамі адзінкі. Народ прагаласаваў дружна за сваіх кандыдатаў. Сталінскі блок комуністаў і беспартыйных перамог!

Ів. Каралькоў.

На здымку: селянін вёскі Жукі, Заблудаўскага раёна, былы палітзняволены тав. Ільяшук М. К. зрабіў з хлеба і дамы шкатулку і пояс з конскіх валос — падарунак таварышу Сталіну ў як удзячнасці за вызваленне беларускага народа. (Фота Сапір)

ГІСТАРЫЧНЫ ДЗЕНЬ

(Пролетарская выбарчая акруга)

Рана прачнуўся Беласток у дзень 24 сакавіка.

Маскоўскае радыё абвяшчае 6 гадзін раніцы. Духавы аркестр клуба тэкстыльшчыкаў іграе „Інтэрнацыянал". Пад урачыстыя гукі пролетарскага гімна малады рабочы 5-га тэкстыльнага камбіната, стахановец Грынцвайг першы апускае ў урну выбарчыя бюлетэні.

—Я з радасцю пачынаю гэты вялікі дзень, — гаворыць тав. Грынцвайг, — выкананнем свайго свяшчэннага грамадзянскага абавязку. Я галасую за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных, за таварышоў Кавалёва, Турлейскага і Пятроўскую.

Паступова запаўняецца народам участак. Штомінутна прыбываюць новыя людзі. За першыя 30 мінут прагаласавала 80 выбаршчыкаў.

У гэты час на ўсіх участках горада кіпіць жыццё. Выбаршчыкі прыходзяць арганізавана, цэлымі дамамі, цэлымі вуліцамі, з песнямі і музыкай.

Уся Пролетарская вуліца ажыла. Спяваючы, ідуць дэманстранты. Гэта жыхары дамоў № 29 і 31 накіроўваюцца на 50 участак. Ветліва, цёпла сустракаюць дарагіх гасцей члены выбарчай камісіі.

Паток выбаршчыкаў на ўчасткі ўсё расце і павялічваецца. К 10 гадзінам раніцы па Пролетарскай акрузе прагаласавала 3.989 чалавек. Да І гадзіны дня на участках №№ 50, 52 і іншых прагаласавала 80 процантаў усіх выбаршчыкаў. Да 6 гадзіны на многіх участках галасаванне было закончана.

У поўным усведамленні свайго высокага грамадзянскага абавязку народ упершыню, з песняй і музыкай, выбіраў сваіх народных прадстаўнікоў. Назаўсёды запомняць гэты гістарычны дзень жыхары горада Беластока.

Лірская

За новае, шчаслівае жыццё

На світанні ў сяле Выверы (Маладзечанскі раён) ля будынка новай школы арганізавана строілася калона выбаршчыкаў калгаса імені Леніна. З кожнай мінутай нарастала вяселле. Успыхвалі бадзёрыя песні, пачыналіся танцы. З вялікім партрэтам мудрага Сталіна, з чырвонымі сцягамі і кумачовымі палотнішчамі лозунгаў калона накіравалася да выбарчага ўчастка.

Ля дома Наума Андрэевіча Бернацкага — кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР — стыхійна пачаўся мітынг. Яго адкрыў старшыня калгаса Павел Кісель.

— Таварышы! — сказаў ён. — У 1936 годзе тут на падпольным комсамольскім сходзе польскімі катамі быў забіт Пётр Андрэевіч Бернацкі. Хто з нас не помніць двухтысячнай дэманстрацыі на пахаванні юнака, клятву яго брата Наума Андрэевіча: адпомсціць за пралітую кроў?! Ні здзекі польскіх жандармаў, ні годы, праведзеныя ў канцэнтрацыйных лагерах не зламалі рэволюцыйнай волі Наума Бернацкага. Працоўныя Маладзечанскага раёна высока ацанілі яго заслугу перад радзімай і вылучылі яго кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

У 6 гадзін раніцы пачынаецца галасаванне. Шчаслівa і горда апускаюць выбаршчыкі бюлетэні з імёнамі настаўніка Антона Сямёнавіча Малевіча, які балатыруецца ў Совет Нацыянальнасцей, селяніна Васілія Сямёнавіча Стома і Наума Андрэевіча Бернацкага. Першым апусціў бюлетэнь селянін Іван Дылеўскі. Звярнуўшыся да старшыні ўчастковай камісіі тав. Вайцылевіча, ён сказаў:

— У апошніх выбарах у польскі сейм ніхто з нашай вёскі Выверы не прымаў удзелу ў галасаванні — не было за каго галасаваць. Сёння ўсе выбаршчыкі прышлі на ўчастак, каб аддаць свае галасы за лепшых прадстаўнікоў працоўнага народа.

Да стала выбарчай камісіі падыходзіць Нікіта Тарасавіч Галюк. Апусціўшы ў урну бюлетэнь, ён гаворыць:

«Тры годы назад таварышы прынеслі мне дамоў сына Міхаіла, забітага панскімі наймітамі. Крывёю абліваласа сэрца, калі закавалі ў кайданы майго старэйшага сына Івана. Прымушаны жыць у зямлянцы, я гадамі не бачыў сонца. Усё гэта мінула і больш ніколі не вернецца. Чырвоная Армія вызваліла майго сына з катаргі. Напярэдадні выбараў я ўступіў у калгас, а сын паехаў вучыцца на курсы трактарыстаў. Вось чаму з такой радасцю я галасаваў за адданых сыноў радзімы, за новае, шчаслівае жыццё». (БЕЛТА).

Што будзе новага на выстаўцы 1940 года

Кожны дзень набліжае нас да адкрыцця Ўсесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі 1940 года. Яго з нецярпеннем чакаюць мільёны калгаснікаў і калгасніц, работнікаў соўгасаў і МТС, спецыялістаў і арганізатараў соцыялістычнага земляробства.

У гэтым годзе па далёка яшчэ не поўных даных у соцыялістычнае спаборніцтва за права ўдзелу па выстаўцы ўключыліся 2.700 раёнаў, 133.600 калгасаў, 4.500 МТС, 1300 соўгасаў, звыш 230.000 брыгад, 500.000 звенняў, звыш поўмільёна перадавікоў, спецыялістаў і арганізатараў сельскай гаспадаркі. Да пачатку сакавіка паступіла ўжо больш 410.000 заяў аб жаданні ўдзельнічаць на выстаўцы. Прыток заяў хутка нарастае, і агульная колькасць удзельнікаў, несумненна, перавысіць поўмільёна.

Красноярскі край прадстаўляе для шырокага паказу па зерневых культурах усю Хакаскую аўтономную область.

Хакасія, соўгасы і калгасы якой дабіліся за апошнія тры годы сярэдняга ўраджаю зярна ў 11.7 цэнтнера з га, будзе экспаніравацца ў зале Сібіры павільёна «Зярно». Ёй прысвячаецца мастацка аформленая цэнтральная ўстаноўка гэтага зала. Жывапіс, скульптура, фатаграфіі, натуральныя экспанаты раскажуць аб дасягненнях хакаскіх калгаснікаў, аб бурным развіцці гэтай обласці, якая была калісьці поўкалоніяй царскай Расіі.

Украіна вылучае для ўдзелу на выстаўцы ўсе 2.500 калгасаў Палтаўскай обласці, якія дабіліся за мінулы год выдатных дасягненняў па свінагадоўлі.

У бягучым годзе, і гэта вельмі радасны факт, значна павялічыцца колькасць раёнаў, якія ў цэлым з'явяцца экспанентамі выстаўкі.

Калі ў мінулым годзе ім было прысвечана шэсць стэндаў, то ў гэтым годзе такіх стэндаў будзе 43. У адным толькі павільёне «Зярно» мяркуецца разгорнута прадставіць чатыры раёны. Сярод іх асаблівую цікавасць выклікае Сальскі раён, Растоўскай обласці. На прыкладзе гэтага раёна экскурсанты і наведвальнікі выстаўкі ўбачаць, як калгаснікі, узброеныя перадавой аграноміяй і магутнай тэхнікай, прымушаюць адступіць засуху. Вялікае пано, шматлікія дыяграмы, фота, табліцы, мадэлі, натуральныя экспанаты дапамогуць наведвальнікам выстаўкі падрабязна азнаёміцца з усім комплексам стаханаўскай агратэхнікі, ужываемай сельскімі калгаснікамі.

Права ўдзелу на выстаўцы заваяваў і Зачапілаўскі раён, Харкаўскай обласці. У гэтым раёне добра арганізавана вучоба калгаснікаў. У шматлікіх стаханаўскіх школах яны вывучаюць вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі, асвойваюць метады работы, якія ўжываліся перадавікамі. Вучоба дапамагае калгаснікам дабівацца значнага павышэння ўраджаяў на палях, уздыму прадукцыйнасці жывёлагадоўлі.

Значна шырэй і паўней будзе прадстаўлена соцыялістычная жывёлагадоўля. На стэндах павільёнаў і на выставачных фермах знойдуць сваё яркае адлюстраванне тыя поспехі, якія дасягнуты калгасамі і соўгасамі ў барацьбе за выкананне рашэнняў партыі і ўрада аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі.

У адным толькі раздзеле «Новае ў вёсцы» будзе прадстаўлена ўдвое больш ферм, чым у мінулым годзе. Усяго-ж на выстаўцы 1940 года мяркуецца паказаць звыш пяці тысяч жывёл і птушак.

Хоць работа па адбору жывых экспанатаў яшчэ не закончана, але ўжо можна сказаць, што сярод прызначаных для выстаўкі жывёл ёсць выключна каштоўныя экземпляры.

Ордэнаносны соўгас «Красный чабан» прышле для паказу ў Маскве барана нашай айчыннай пароды «асканійскі рамбулье». На працягу года гэта жывёла, якая важыць восем пудоў, дае 18 кілограмаў высокасортнай воўны. Такой колькасці воўны дастаткова для выпрацоўкі найлепшай матэрыі на восем касцюмаў. Амаль дваццаць метраў шарсцяной тканіны лепшай якасці можна вырабіць з гадавога настрыгу другога барана, які пасылаецца на выстаўку соўгасам «Червленые буруны».

Калгас «Сталинский путь», Кіраўскай обласці, у ліку іншых экспанатаў сва жывёлагадоўчых ферм пакажа свінматку «Неву-11», якая вызначаецца рэкорднай даўжынёй свайго тула — 196 сантыметраў. Сярод летніх экспанатаў свінаферм найбольшую даўжыню тулава мее кнур «крэт» — 192 см.

Многа нова і цікавага ўбачаць наведвальнікі ў павільёне «Механізацыі».

Зараз 17 водаў Галоўсельмаша рыхтуюць для паказу на выстаўцы 213 экспанатаў машын, з якіх 73 з'яўляюцца навінкамі. Сярод іх — эксперыментальныя ўзоры 30-футавага камбайна «Сталінец-5», раслінажывіцель, квадратная сеялка з шырынёй міжрадзя ў 50 міліметраў для ефрэмаўскіх пасеваў, травяная сеялка. На Запарожскім заводзе «Комунар» выраюцца для выстаўкі новы шырозахватны камбайн (у 40 футаў), мадэрнізаваны камбайн з матавіла канструкцыі вынаходца тав. К..., які дае магчымасць убіраць палеглы хлеб, а таксама камбайн з прыстасаваннямі для ўборкі тэхнічных культур.

Вялікую цікавасць прадстаўляе буракакамбайн Одэскага завода імені Кастрычніцкай рэволюцыі, які механізіруе ўборку буракоў.

Група трактарыстаў-ордэнаносцаў з Варонежскай обласці, агледзеўшы экспанаты Харкаўскага трактарнага завода, паказаныя на выстаўцы 1939 года, рэкамендавала ўнесці істотныя змяненні ў розныя дэталі трактара. Новыя экспанаты гэтага завода зроблены ўжо з улікам гэтых пажаданняў знатных трактарыстаў.

Харкаўскі завод «Серп и молот» узамен зернаачышчальнай машыны «ВІМ-СМ-1» у гэтым годзе пакажа больш дасканалую машыну «ВІМ-СМ-2». На ёй можна ачышчаць не толькі зерневыя, але і насенне траў, проса. Прадукцыйнасць яе на 40 процантаў вышэй «ВІМ-СМ-1». Па прапанове наведвальнікаў выстаўкі 1939 года палепшана канструкцыя трыера зернаачышчальнай машыны. Ён значна аблегчан у вазе, спрошчан яго мантаж, што дае вялікую эканомію металу.

У калгасах выраслі новыя выдатныя кадры трактарыстаў. Нямала сярод іх і жанчын. Аб рабоце гэтых выдатных майстраў машынізаванага земляробства раскажуць стэнды ва ўсіх павільёнах выстаўкі.

Некалькі год назад трактарыстка МТС імені Вільямса, Бузулукскага раёна, Чкалаўскай обласці, Ефрасіння Драбышова дала абяцанне прыцягнуць сваіх падруг на сялу да вучобы на курсах трактарыстак, навучыць іх стаханаўскім метадам працы. Сваё абяцанне ордэнаносец Драбышова выканала з чэсцю. У мінулым годзе ў МТС імені Вільямса працавалі ўжо 48 дзяўчат-трактарыстак. Вучаніцы Драбышовай дасягнулі высокіх паказчыкаў і трыццаць з іх заваявалі пачотнае права ўдзелу на выстаўцы 1940 года.

Цікавымі і павучальнымі будуць новыя стэнды павільёна «Торф». На адным з іх будуць паказаны дасягненні беларускага соўгаса «Рэчыца». За тры апошнія годы соўгас асушыў і ператварыў у культурнае пахатнае поле дзве тысячы гектараў балот. Шырокае ўжыванне тарфяных угнаенняў пакажа калгас імені Кірава, Гарадзенкага раёна, Горкаўскай обласці. Калгас «Памяці Ільіча», Мыцішчынскага раёна, Маскоўскай обласці, прадэманстрыруе выраб і ўжыванне для вырошчвання гародніны тарфяных гаршчкоў. З іх дапамогаю ўдаецца спрасціць высадку расады, палепшыць умовы развіцця раслін і павысіць ураджай.

Значна больш поўна, чым у мінулым годзе, будзе паказан рост хімізацыі сельскай гаспадаркі і дасягненні перадавікоў у гэтай справе.

Нямала стэндаў будуць асвятляць жыццё і работу перасяленчых калгасаў, якія вядуць сваю гаспадарку на новых землях.

Ва ўсёй велічы і разнастайнасці прадэманстрыруе выстаўка 1940 года культуры совецкай вёскі. Ёй будзе прысвечан спецыяльны зал у галоўным павільёне. Наведвальнік тут убачыць у макетах і на фота ўзорныя школы, паркі, бальніцы, радзільныя дамы, яслі, хаты-чытальні, усё, што ёсць цяпер у кожным калгасе. Асобны павільён прысвячаецца паказу развіцця фізкультуры і спорту сярод калгаснікаў.

Няма ніякай магчымасці нават коратка пералічыць тое новае, што будзе адрозніваць выстаўку 1940 года ад мінулагодняй. Гэта новае наведвальнік знойдзе ў кожным павільёне, на ўсіх адкрытых участках і ў садах выстаўкі.

Выстаўка сёлетняга года яшчэ шырэй, паўней і ярчэй асветліць дасягненні нашай сельскай гаспадаркі і будзе садзейнічаць новым перамогам калгаснага ладу.

І. Ганаў.

ЗАЎТРА Ў БЕЛАСТОКУ ПАЧНЕЦЦА АБЛАСКАЯ АЛІМПІЯДА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

ВЯЛІКІЯ МАГЧЫМАСЦІ

Мастацкая самадзейнасць у заходніх абласцях БССР развіваецца хуткім тэмпам. Цяга да культуры, да аўладання вышынямі совецкага мастацтва вельмі вялікая. Вызвалены народ атрымаў велізарнейшыя магчымасці для росквіту сваіх мастацкіх сіл, для выяўлення сваіх талентаў. Творчая ініцыятыва б'е крыніцай, яна атрымлівае сваё выяўленне ў мностве арганізаваных у гарадах і вёсках калектываў мастацкай самадзейнасці.

Яркай ілюстрацыяй становішча мастацкай самадзейнасці з'явілася праведзеная алімпіяда Гродненскага раёна. У падрыхтоўцы да гэтай алімпіяды прымала ўдзел звыш 2.000 чалавек. На алімпіядзе выступіла 500 удзельнікаў, сярод якіх асабліва вылучыліся харавы калектыў мястэчка Крынкі, хор мястэчка Скідзель, 52-гадовая танцорка Лапа Соф'я Паўлаўна, баяніст Лысенка, танцавальныя калектывы мястэчка Берастравіцы і мястэчка Марцінканцы, спявачка Крашэвіч Сара, дэкламатары Багаш, Леў і інш.

У маі гэтага года беларускі народ будзе дэманстрыраваць свае культурныя дасягненні ў Маскве перад любімым правадыром таварышам Сталіным. Акрамя прафесіянальнага мастацтва ў дэкадзе прымуць удзел прадстаўнікі народнага самадзейнага мастацтва, сярод якіх павінны быць лепшыя калектывы і выканаўцы нашай вобласці.

Згодна рашэння партыі і ўрада на тэрыторыі заходніх абласцей нашай радзімы праводзяцца раённыя прагляды мастацкай самадзейнасці, на якіх адбіраюцца лепшыя сілы для ўдзелу ў абласных алімпіядах. Прагляды ў раёнах нашай вобласці выявілі нямала здольных, таленавітых людзей, але разам з гэтым яны паказалі, што ў многіх раёнах яшчэ не ўдзяляецца дастатковай увагі справе развіцця мастацкай самадзейнасці.

Нельга забываць, што мастацкая самадзейнасць выконвае вялікую палітычную ролю ў палітыка-выхаваўчай рабоце працоўных. Праз удзельнікаў гурткоў мы абавязаны несці ў масы сапраўднае мастацтва і культуру, нацыянальную па форме, соцыялістычную па змесце, мастацтва, якое выхоўвае масы ў духу комунізма.

Таленавіты, моцна згуртаваны калектыў мастацкай самадзейнасці ў клубе, на прадпрыемстве, у вёсцы з'яўляецца важнейшым палітычным і культурным фактарам. Клопаты аб гэтым калектыве, аб кожным таленавітым чалавеку з'яўляюцца абавязкам кожнага кіраўніка раёна, горада, прадпрыемства, клуба і сельсовета.

Нідзе, ні ў адной краіне ў свеце не створаны такія спрыяльныя ўмовы для развіцця народных талентаў як у СССР. Урад і комуністычная партыя ўдзяляюць вялікую ўвагу справе развіцця народнай творчасці ва ўсёй яе разнастайнасці. Дзяржава адпускае мільёны на справу кіраўніцтва і арганізацыі мастацкай самадзейнасці. Лепшым прадстаўнікам народнай творчасці прадастаўлена магчымасць вучыцца і развіваць свае таленты, а таксама папаўняць рады нашых прафесіянальных арганізацый мастацтваў. Многія калектывы і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці ўзнагароджаны ўрадам за іх заслугі перад соцыялістычнай радзімай у галіне культуры і мастацтва.

Няма сумнення, што абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці, якая пачнецца заўтра ў Беластоку, з'явіцца яркай дэманстрацыяй росквіту творчых сіл вызваленага народа, пакладзе пачатак вялікай рабоце па выяўленню і вырошчванню народных талентаў.

М. Бейлінаў,
дырэктар абласнога Дома народнай творчасці.

Мастацкая самадзейнасць тэкстыльшчыкаў

25 сакавіка ў клубе тэкстыльшчыкаў пачаўся першы гарадскі прагляд мастацкай самадзейнасці тэкстыльшчыкаў. У праглядзе ўдзельнічалі рабочыя 3-га камбіната, 31, 23 і 24 фабрык. Зал клуба перапоўнен рабочымі фабрык і прадпрыемстваў, якія прышлі паслухаць выступленні сваіх таварышоў.

Лепшым мастацкім калектывам аказаўся хор 24-й тэкстыльнай фабрыкі ў саставе 20 чалавек. Яны выконваюць на 4 галасы совецкую песню „Маладосць", „Марш жаночай брыгады" кампазітара Дунаеўскага і іншыя. Хор мае таленавітага маладога саліста рабочага тав. Кашыцэра, які з пачуццём выканаў песню „Любушка" і „Простую песеньку".

На вечары выступалі здольныя індывідуальныя выканаўцы. З жывасцю прачытаў рабочы 23-й тэкстыльнай фабрыкі тав. Гохберг урывак верша „Машыны" з кінофільма „Турбіны". Відаць было, што расказчык выдатна адчувае пульс і рытм машыны, што ён умела перадае іх у сваім выкананні.

Многа дэкламатараў, музыкантаў, танцораў прыслаў на прагляд 3-ці тэкстыльны камбінат. Добрым выкананнем рамансаў вызначыўся рабочы 3-га камбіната тав. Кракус, які іграў на ім-жа зробленым інструменце.

17-гадовая работніца гэтага-ж камбіната Галіна Шаставіцкая прачытала на польскай мове верш Светлова „Грэнада" і рускі твор „Шчаслівым жанчынам".

На вечары выступаў харавы ансамбль 31 плюшавай фабрыкі ў саставе 30 чалавек. Хор мае добрыя сілы і, несумненна, пры узмоцненай працы над сабою зможа даць выдатныя выступленні.

Выступалі таксама індывідуальныя выканаўцы 3-га тэкстыльнага камбіната, якія чыталі творы на яўрэйскай, польскай і рускай мовах.

Учора прагляд мастацкай самадзейнасці тэкстыльшчыкаў працягваўся.

Л. Рудзік

На здымку: група студэнтаў Беластоцкага педінстытута ў час перапынку. Адна з студэнтак чытае ўголас свой твор аб Сталінскай Канстытуцыі (Фота Сапір).

ПЕРШЫЯ ДНІ ЗАНЯТКАЎ У ПЕДІНСТЫТУЦЕ

На ўсіх чатырох факультэтах Беластоцкага педінстытута ідуць нармальныя заняткі. 125 чалавек — дзеці рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі, якія не мелі доступу ў вышэйшую навучальную ўстанову ва ўмовах былой панскай Польшчы, упарта авалодваюць ведамі, каб потым стаць совецкімі педагогамі.

Нацыянальны састаў студэнтаў самы разнастайны. Тут ёсць беларусы і рускія, палякі і яўрэі, адзін немец, татарын і грузін. Сярод студэнтаў—38 жанчын.

Большасць паступіўшых у педінстытут скончылі ліцэй, але ёсць нямала і з незакончанай сярэдняй адукацыяй. Яны вымушаны былі пакінуць сярэднюю школу, не маючы сродкаў плаціць за навучанне, і працягвалі павышэнне сваіх ведаў самаадукацыяй. Прыёмныя іспыты паказалі, што ліцэі ў былой Польшчы не давалі ўсебаковай сярэдняй асветы. Так, скончыўшыя гуманітарныя ліцэі зусім не ведалі хіміі, паказалі зусім слабыя веды па матэматыцы і фізіцы. Скончыўшыя фізіка-матэматычныя ліцэі ведалі нядрэнна матэматыку і фізіку, але зусім не арыентыраваліся ў самых элементарных пытаннях па другіх прадметах.

Найбольш вузкім месцам з'яўляецца няведанне большасцю студэнтаў рускай мовы. Пачаць прышлося з азбукі. Але студэнты з вялікай ахвотай і настойлівасцю ўзяліся за вывучэнне рускай мовы—мовы Леніна і Сталіна, мовы Пушкіна і Горкага. Выкладчыца рускай мовы тав. Лапацінская ўжо за першыя дні вучобы дабілася значных поспехаў па свайму прадмету. Яна ўпэўнена, што да 1 верасня, калі пачнецца дадатковы набор у педінстытут, цяперашні састаў студэнтаў авалодае рускай мовай за курс сярэдняй школы.

Сярод студэнтаў наладжана выхаваўчая работа. Штодзённа ў інтэрнаце з 11 гадзін вечара праводзіцца палітінфармацыя. Для студэнтаў чытаюцца лекцыі і даклады па розных тэмах. Распачалі сваю работу арганізацыі Асоавіяхіма і МОПР'а.

З 1 красавіка адкрыецца кабінет марксізма-ленінізма, дзе студэнты змогуць атрымаць кансультацыю па гісторыі ВКП(б). Тут-жа будзе бібліятэка з твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Амаль усе студэнты забяспечаны стыпендыяй і інтэрнатам. Атрымаўшы вялікае права на асвету, яны прыкладаюць усе свае сілы і энергію, каб стаць поўнацэннымі совецкімі спецыялістамі.

Т. Лясовіч

Сустрэча школьнікаў з артыстамі

Весела і цікава праводзяць свае вясеннія канікулы школьнікі горада Беластока. 25 сакавіка вучні старэйшых класаў сустрэліся з артыстамі Другога Беларускага драматычнага тэатра.

На сустрэчы мастацкі кіраўнік тэатра тав. Аксёнаў правёў з вучнямі гутарку аб рабоце совецкага мастацтва. Школьнікі задавалі многа цікавых пытанняў. На сустрэчы выступілі ражысёр тэатра тав. Іваноў, артыстка Краўчанка і іншыя.

Калектыў тэатра абяцаў дапамагчы школьнікам узорна падрыхтавацца да прадстаячай усесаюзнай алімпіяды дзіцячай творчасці.

Артысты прачыталі рад мастацкіх расказаў і вершаў. Сустрэча прайшла ў дружнай і цёплай абстаноўцы.

СПАРТЫЎНАЕ ЖЫЦЦЁ

* * *

Здаюць нормы на абаронныя значкі

Дзейную абаронна-фізкультурную работу разгарнуў фізкультурны калектыў трэцяй поўнай сярэдняй школы г. Беластока. Пры школе працуюць розныя секцыі: лыжная, лёгка-атлетычная, боксавая, кіраўнікамі якіх з'яўляюцца самі вучні. Тут таксама створаны курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў школьных нізавых секцый.

У апошнія дні фізкультурнікі школы здаюць нормы на значкі ГПА (Гатоў да працы і абароны), БГПА (Будзь гатоў да працы і абароны). На значок ГПА па лыжах і гімнастыцы здалі нормы 20 вучняў. На значок БГПА па лыжах і вольных рухах—96.

Усю гэту работу ўзначальвае школьны фізкультурны камітэт пад кіраўніцтвам фізрука тав. Дзерэчынскага.

★

Спартыўнае таварыства „КІМ"

Днямі прайшлі сходы рабочых і служачых комунальнага абслугоўвання горада Беластока па пытанню стварэння свайго ўласнага спартыўнага таварыства „КІМ".

Па галінах вытворчасці створаны аргбюро, якія прыступілі да запісу ў члены таварыства. Так, ад работнікаў цырульняў паступіла 40 заяў аб прыняцці іх у члены таварыства.

Адбылася нарада ўсіх членаў оргкамітэтаў, якая намеціла далейшыя перспектывы работы таварыства.

★

Работа асоавіяхімаўскай арганізацыі

Асоавіяхімаўскія арганізацыі Гродна праводзяць вялікую масава-палітычную работу сярод дапрызыўнікаў. Яны дапамагаюць ім авалодаць майстэрствам стральбы, ліквідаваць сваю малапісьменнасць і непісьменнасць. Акрамя гэтага асоавіяхімаўцы вывучаюць з дапрызыўнікамі матэрыяльную частку вінтоўкі, навучаюць стральбе да задачы норм на значок «Гатоў да працы і абароны». Дапрызыўнікі актыўна рыхтуюцца стаць доблеснымі воінамі гераічнай Чырвонай Арміі.

Мастацтва адроджанага народа

Партыя і ўрад удзяляюць вялікую ўвагу развіццю мастацтва. За годы совецкай улады ўсе галіны соцыялістычнага мастацтва дасягнулі бурнага росквіту. Ленінска-сталінская нацыянальная палітыка падняла з народных мас незлічоныя таленты, стварыла выдатныя творчыя кадры, забяспечыла магутную матэрыяльную базу для развіцця мастацтва.

Гераічная барацьба будаўнікоў соцыялізма дала багацейшую тэматыку для совецкай сцэны і экрана, для музыкальных вобразаў і буйных палотнаў. Совецкімі майстрамі створана нямала непраўзыйдзеных узораў мастацтва, уваходзячых у ліку лепшых твораў у скарбніцу сусветнай культуры.

Пад жыватворчымі праменнямі Сталінскай Канстытуцыі пышна расцвіло мастацтва беларускага народа. Да Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі нацыянальнае беларускае мастацтва бязлітасна папіралася нагамі царскіх сатрапаў. Не магло быць і гутаркі аб існаванні беларускага нацыянальнага тэатра, жывапісі, кінематаграфіі. Толькі дзе-ні-дзе ў гарадах існавалі правінцыяльныя рускія тэатры, якія абслугоўвалі гарадскіх багацеяў і чыноўніцтва.

Зараз у БССР існуе 17 тэатраў, сярод якіх Беларускі тэатр оперы і балета ў Мінску, беларускія драматычныя тэатры ў Мінску і Віцебску, драматычны яўрэйскі тэатр у Мінску, драматычны рускі тэатр у Магілеве, тэатры драматычны рускі і музкамедыі ў Гомелі, тэатры юнага гледача, лялечны тэатр, сем калгасна-соўгасных тэатраў у Полацку, Слуцку, Бабруйску і іншых гарадах. Некалькі гадоў існуе дзяржаўная філармонія, Белдзяржэстрада, некалькі дамоў народнай творчасці, карцінная галерэя і цэлы рад іншых устаноў і арганізацый.

Творчымі работнікамі створана нямала высокамастацкіх твораў. Даволі ўпамянуць аб беларускіх операх «Дрыгва», «Міхась Падгорны», «Кветка шчасця», «Кацярына», аб балеце «Салавей», аб такіх п'есах, як «Пагібель воўка», «Хто смяецца апошнім», «Пад ракой Бярозай», «Цудоўная дудка», «Партызаны» і г. д.

У БССР існуе вышэйшая музыкальная ўстанова — кансерваторыя, 4 музыкальных вучылішчы, 11 музыкальных школ, тэатральнае і мастацкае вучылішчы, вячэрняя музыкальная школа для дарослых.

БССР рыхтуецца да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, дзе будуць прадэманстрыраваны дасягненні беларускага народа як у галіне прафесіянальнага мастацтва, *так і народнай творчасці.*

У совецкай краіне работа ў мастацтве—пачотная прафесія. У саставе вярхоўных і мясцовых органаў совецкай улады нямала работнікаў мастацтва. Лепшыя майстры ўдастоены ўзнагароды ордэнамі СССР. Партыя, таварыш Сталін любоўна вырошчваюць творчыя кадры, усямерна дапамагаюць развіццю нацыянальных мастацтваў.

Перад з'едданым беларускім народам адкрыты самыя шырокія перспектывы для развіцця совецкага мастацтва і ў заходніх абласцях БССР.

Працоўныя былой Заходняй Беларусі добра ведаюць, што для працоўнага народа пры панскім панаванні мастацтва было зусім недаступна. Беларускае мастацтва было строга забаронена. Адзіны беларускі тэатр, які існаваў калісьці ў Вільні, быў ужо даўно закрыт. Аб беларускай оперы, драме вядома і гаварыць не прыходзілася. Рускі і яўрэйскі тэатры праследваліся і прыцясняліся. Наогул мастацтва знаходзілася на вельмі нізкай ступені свайго развіцця. Нават польскія тэатры, якія знаходзіліся на прывілеяваным становішчы, не падняліся на колькі-небудзь салідны мастацкі ўзровень.

Работнікі мастацтва жылі ў беднасці, сярод іх велізарная колькасць былі беспрацоўнымі.

З першых-жа дзён вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад панскага прыгнёту ў гарадах і сёлах *успыхнула яркае святло совецкай* культуры. Гэтыя першыя светачы ведаў, сапраўды народнай культуры, мастацтва несла з сабой армія-вызваліцельніца, слаўная Чырвоная Армія. Страснае слова большэвіцкай праўды, лепшыя совецкія фільмы, паказ новых, нябачаных дагэтуль мастацкіх пастановак, баявая, захапляючая ўдаль чырвонаармейскай творчасці — усё гэта рабіла чароўнае ўражанне на масы, клікала на барацьбу за ўмацаванне ўлады Советаў.

Вызвалены народ прагна пацягнуўся да культуры, мастацтва. І ён не памыліўся ў сваіх надзеях.

Партыя і совецкі ўрад прынялі найшырэйшую праграму культурнага будаўніцтва ў заходніх абласцях БССР, у тым ліку і ў галіне мастацтва. Аб размаху работы можна судзіць хаця-б па таму, што ў цэлым па рэспубліцы на мастацтва выдаткоўваецца звыш 50 мільёнаў рублёў.

У заходніх абласцях арганізуецца сем тэатраў: беларускія драматычныя ў Баранавічах і Пінску, рускія—у Брэсце і Гродна, польскія—у Беластоку, яўрэйскі—у Брэсце. У Гродна ствараецца лялечны тэатр. Апрача гэтага ствараюцца два аддзяленні дзяржаўнай эстрады—у Беластоку, з тэатрам мініятур, і ў Баранавічах, з цыганскім ансамблем, а таксама чатыры музыкальных калектывы: сімфанічны аркестр, хор, джаз-аркестр, музыкальны ансамбль.

Па лініі выяўленчага мастацтва арганізуюцца два мастацкіх музеі, два дамы мастака, чатыры выстаўкі выяўленчага мастацтва. Ва ўсіх абласных цэнтрах будуць працаваць дамы народнай творчасці, якія закліканы стварыць шырокую сетку гурткоў мастацкай самадзейнасці.

Ужо ў 1940 годзе прадпрымаюцца вялікія крокі па лініі падрыхтоўкі кадраў мастацтва.

У Брэсце і Беластоку арганізуюцца музыкальныя вучылішчы (тэхнікумы) з кантынгентам навучаючыхся ў 150 чалавек. Тысяча дзяцей будзе навучацца ў васьмі музыкальных школах без адрыву ад сваёй асноўнай вучобы. Гэтыя школы адкрываюцца ва ўсіх абласных цэнтрах, а таксама ў Маладзечна, Валкавыску і Лідзе.

У Беластоку будзе працаваць мастацкае вучылішча, дзе дзеці будуць навучацца выяўленчаму мастацтву. Апрача гэтага ў Беластоку, Пінску і Брэсце будуць працаваць гадзічныя студыі выяўленчага мастацтва.

Намечана арганізаваць рад курсаў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы кадраў мастацтва.

Работнікі мастацтва аказваюць вялікую канкрэтную дапамогу сваім таварышам па рабоце ў заходніх абласцях.

Так, у Баранавічах будзе працаваць трупа Рагачоўскага тэатра, у Пінску — Заслаўльскага тэатра. Трупа Гродненскага тэатра камплектуецца з выпускнікоў Маскоўскага дзяржаўнага інстытута тэатральнага мастацтва, буйнейшыя творчыя сілы СССР і БССР далі ўжо нямала гастрольных пастановак у заходніх абласцях, знаёмячы працоўных з лепшымі ўзорамі совецкага мастацтва.

Тэатры заходніх абласцей узяліся за сур'ёзную, паглыбленую работу. Яны пакажуць гледачам лепшыя творы совецкай драматургіі і класічнага рэпертуара. Музыкальныя і харавыя калектывы панясуць у масы ўзоры сусветнай і совецкай музыкальнай культуры.

У рэпертуары тэатраў заходніх абласцей такія п'есы, як «Васса Жэлезнова», «Каварства і любоў», «Платон Крэчэт», «Пагібель воўка», «Партызаны», «Сын народа», «Хто смяецца апошнім», «У пушчах Палесся» і г. д.

Прыемна адзначыць, што ўжо зараз у заходніх абласцях паднялася шырокая хваля народнай творчасці, усюды растуць калектывы мастацкай самадзейнасці. Але гэта яшчэ толькі пачатак. Ленінскае палажэнне аб тым, што сярод народа маюцца невычарпальныя крыніцы талентаў — вельмі быстра знойдзе сваё пацверджанне ў жыцці працоўных заходніх абласцей. Гэтае палажэнне таксама бліскуча пацверджана ўсім ходам развіцця культуры совецкага народа.

Як і ва ўсім Саюзе ССР, у заходніх абласцях Совецкай Беларусі мастацтва стала мастацтвам народа, мастацтвам для народа.

Б. Па...

ЗА РУБЯЖОМ

ВАЙНА НА МОРЫ

ЛОНДАН, 25 сакавіка. (ТАСС) У Капенгагене афіцыяльна аб'яўлена, што англійская падводная лодка патапіла ля пабярэжжа Ютландыі германскі параход „Эдмунд гуго стынетс" вадазмяшчэннем у 2.189 тон. Капітан парахода ўзят у палон. Астатняя каманда вызвалена.

ЛОНДАН, 25 сакавіка. (ТАСС). Учора ля пабярэжжа Паўночнай Шатландыі затануў дацкі параход „Брыта" вадазмяшчэннем у 1.146 тон. Капітан і чатыры матросы выратаваны. Астатнія 15 чалавек каманды, відавочна, загінулі.

БЕРЛІН, 25 сакавіка. (ТАСС) Інфармацыйнае бюро перадае, што турэцкі параход „Сакарыйя" быў затрыман англійскім ваенным караблём паблізу вострава Тэнедос у межах турэцкіх тэрытарыяльных вод і прыведзен у Хайфу, дзе знаходзіцца ўжо тры тыдні.

Па газетных паведамленнях, у Хайфе з другога сакавіка знаходзіцца дацкі параход „Брыгітэн", які быў затрыман англійскім кантролем у Гібралтары. Параход ішоў з грузам, прызначаным для Турцыі.

АНГЛІЙСКАЕ ГАНДЛЁВАЕ СУДНАХОДСТВА І ВАЙНА

Англійскі друк і афіцыяльныя органы імкнуцца паменшыць страты англійскага флота ў вайне.

Вельмі цікавыя звесткі, якія прыведзены аглядальнікам газеты „Іўнінг стандарт". Ён указвае, што за першыя пяць месяцаў цяперашняй вайны англійскі гандлёвы флот страціў 656 тысяч тон (зараз гэтыя страты, відавочна, дасягаюць 800 тысяч тон), у той час, як за першыя пяць месяцаў вайны 1914-1918 г. г.—толькі 141 500 тон. Рэальны танаж англійскага гандлёвага флота к пачатку вайны складаў толькі 12 мільёнаў тон.

Рух у Англіі супроць імперыялістычнай вайны

ЛОНДАН, 25 сакавіка. (ТАСС). На нядаўна адбыўшайся чарговай канферэнцыі агульнаанглійскай асацыяцыі настаўнікаў, якая ўваходзіць у лейбарысцкую партыю, пераважнай большасцю галасоў была прынята рэзалюцыя, у якой гаворыцца, што імперыялістычная вайна ў Еўропе ідзе ў шкоду кроўным інтарэсам народных мас. Рэзалюцыя заклікае яшчэ шырэй выкрываць характар цяперашняй імперыялістычнай вайны ў Еўропе і мабілізаваць шырокія масы працоўных на барацьбу супроць антысавецкіх прошукаў англійскай буржуазіі.

Нядаўна адбылася канферэнцыя лейбарысцкай арганізацыі Новага Паўднёвага Уэльса (Аўстралія). Значнай большасцю галасоў канферэнцыя адобрыла рэзалюцыю, якая патрабуе неадкладнага спынення вайны ў Еўропе і заключэння міру.

У рэзалюцыі асуджаюцца таксама антысавецкія прошукі англа французскіх падпальшчыкаў вайны.

ЛОНДАН, 25 сакавіка. (ТАСС). Група кіраўнікоў дэмакратычных юнацкіх арганізацый прыняла зварот, у якім асуджае імперыялістычную вайну і выступае супроць узмацняючагася наступлення на жыццёвыя правы рабочага класа. У звароце ўказваецца, што англійская і французская моладзь „прынесена ў афяру эгаістычным інтарэсам праві целяў Англіі і Францыі".

АГЕНЦТВА ГАВАС АБ ВАЕННЫМ КАБІНЕЦЕ РЭЙНО

ПАРЫЖ, 26 сакавіка (ТАСС). Агенцтва Гавас перадае наступнае паведамленне: „Ваенны кабінет, створаны Рэйно, прадстаўляе сабой новую ўрадавую арганізацыю. У прыватнасці, не трэба змешваць ваенны кабінет з „ваенным камітэтам". „Ваенны камітэт" — арганізацыя, якая існуе ўжо каля двух год. Яна была створана законам ад 11 ліпеня 1938 года і павінна была займацца арганізацыяй абароны ў ваенны час. Згодна гэтаму закону, агульнае кіраўніцтва належыць ураду. Роля „ваеннага камітэта" заключаецца толькі ў тым, каб растлумачваць ваенныя перспектывы, якія садзейнічаюць выкананню агульных рашэнняў урада. Камітэт, старшынёй якога з'яўляецца прэзідэнт рэспублікі, мае ў сваім саставе прэм'ера, міністраў, ведамствы, якія таксама маюць адносіны да нацыянальнай абароны.

Ваенны кабінет, створаны Рэйно, з'яўляецца, наадварот, урадавай арганізацыяй, у якую ўваходзяць толькі міністры тых ведамстваў, якія непасрэдна заняты нацыянальнай абаронай. Ён ўзначальваецца прэм'ерам і з'яўляецца ў некаторым родзе больш вузкім саветам міністраў, прадназначаным спецыяльна для агульнага кіраўніцтва ваеннай палітыкай, што з'яўляецца прэрагатывай урада. Рэйно рашыў склікаць гэты кабінет тры разы ў тыдзень".

Разнагалоссі у радыкал-соцыялісцкай партыі Францыі

БЕРЛІН, 25 сакавіка (ТАСС) Жэнеўскі карэспандэнт агенцтва Трансацэан паведамляе, што ва французскіх палітычных кругах чакаюць узмацнення разнагалоссяў у радыкал-соцыялісцкай партыі, калі Даладʻе не ўдасца пераканаць членаў партыі ў тым, што яго прабыванне ў кабінеце Рэйно неабходна па ваенных прычынах. У дыпламатычных кругах у Жэневе заяўляюць, што 23 сакавіка старшыня палаты Эрыо (адзін з радыкал соцыялістаў, устрымаўшыхся ад галасавання вотума давер'я кабінету Рэйно) меў 2-гадзінную гутарку з Даладʻе. У час гэтай гутаркі Эрыо заявіў Даладʻе, што ён не намерваецца змяніць сваіх адмоўных адносін да ўрада Рэйно і што Даладʻе павінен ведаць, што толькі 33 радыкал-соцыялісты галасавалі за Рэйно, у той час як 10 нават падалі свае галасы супроць яго. З прычыны гэтага ў палітычных кругах Парыжа сцвярджаюць, што немінучы раскол радыкал-соцыялісцкай партыі, калі Даладʻе не пойдзе ў адстаўку пры бягучым урадавым крызісе, які чакаецца ў бліжэйшы час.

СТАНОВІШЧА РАБОЧАГА КЛАСА ВА ФРАНЦЫІ

Больш поўгода Францыя вядзе вайну з Германіяй. Кожны дзень гэтай вайны каштуе Францыі мільярд франкаў.

А між тым усім вядома, што ваенныя дзеянні на заходнім фронце ідуць вельмі вяла. Зусім ясна, што ў далейшым вайна патрэбуе яшчэ больш выдаткаў.

Адкуль-жа бяруцца гэтыя сродкі? Канечна, з кармана працоўнага насельніцтва. Французскі парламент пастанавіў павялічыць суму падаткаў у параўнанні з мінулым годам. Нават буржуазныя французскія газеты прызнаюць, што дадатковыя падаткі будуць плаціць не капіталісты, якія моцна нажываюцца на вайне, а рабочыя і сяляне. Ва Францыі выдан цяпер закон, па якому ўсе рабочыя ва ўзросце ад 18 да 49 год абкладзены спецыяльным ваенным падаткам у размеры 15 працантаў іх заработка. Між тым французскі рабочы клас і без таго плоціць вельмі высокія падаткі.

Але гэтым не абмяжоўваюцца афяры, якія французскія рабочыя вымушаны прыносіць для таго, каб правячыя класы маглі весці злачынную імперыялістычную вайну.

Каля чатырох год назад французскі рабочы клас пасля ўпартай барацьбы дабіўся ўвядзення 40-гадзіннага рабочага тыдня, абавязковага заключэння калектыўных дагавораў, аплаты водпускаў і г. д.

На працягу раду год буржуазія старалася звесці нанішто гэтыя перамогі рабочых.

У 1938 і 1939 гг. становішча рабочага класа значна пагоршылася ў параўнанні з 1936 годам. У пачатку мінулага года ўрад выдаў дэкрэт, па якому 40-гадзінны рабочы тыдзень быў заменен у радзе галін прамысловасці 60-гадзінным, а зарплата асталася тая-ж, хоць рабочых прымушалі працаваць на фабрыкантаў і заводчыкаў у паўтара раза больш ранейшага. Як толькі пачалася вайна, капіталісты дабіліся ўвядзення 11 і 12-гадзіннага рабочага дня, прычым рабочы не атрымліваў нават належачай яму аплаты звышурочных гадзін. Калі прадпрыемцу выгадна, рабочы пазбаўляецца нават выхаднога дня.

Французская прамысловасць, якая працуе на патрэбы грамадзянскага насельніцтва (напрыклад, тэкстыльная), вельмі моцна скараціла вытворчасць, бо не хватае сыравіны і транспарта. Сотні тысяч рабочых выкінуты на вуліцу і не могуць знайсці сабе справы. Атрымаць-жа дапамогу па беспрацоўю ва Францыі не так проста. Для гэтага патрабуецца, напрыклад, пражыць на адным месцы не менш чатырох месяцаў. А вядома, што беспрацоўныя ў пошуках работы вандруюць з месца на месца (асабліва гэта адносіцца да сезонных рабочых).

У законы аб калектыўных дагаворах і аб разборы працоўных канфліктаў французскі рэакцыйны ўрад унёс столькі «паправак», што, па сутнасці, рабочыя пазбаўлены ўсякай абароны іх правоў.

Капіталісты праводзяць сваё наступленне на рабочы клас не адны, а пры дапамозе здраднікаў з французскай соцыялістычнай партыі і прафсаюзнага цэнтра — Усеагульнай канфедэрацыі працы. Гэтыя людзі, якія называюць сябе «соцыялістамі», адкрыта сталі на бок капіталістаў і ў абарону імперыялістычнай бойні.

Толькі адна партыя была і асталася вернай французскаму рабочаму класу — комуністычная партыя. Комуністычная партыя Францыі забаронена, маёмасць яе канфіскавана, газеты закрыты. Комуністаў, дэпутатаў парламента, пазбавілі іх дэпутацкай годнасці. Комуністаў ва Францыі травяць. Нават усіх спачуваючых комунізму падвяргаюць арышту і прыгаварываюць да суровага пакарання.

І ўсё-ж французская компартыя існуе і працуе. У падполлі яна вядзе сваю работу не менш актыўна, чым раней. Комуністычная газета «Юманітэ» рэгулярна выходзіць у свет, надрукаваная на ручных машынах; яе перадаюць з рук у рукі і чытаюць сотні тысяч чалавек. Аўтарытэт компартыі ў рабочых масах моцна ўзрос. Адзін з прадстаўнікоў французскіх рэакцыянераў з жаласцю гаварыў нядаўна ў парламенце, што буйнейшыя заводы краіны «перапоўнены» комуністамі.

Компартыя растлумачвае працоўным, што імперыялістычная вайна не патрэбна ім, што яна вядзецца ў інтарэсах капіталістаў, якія разлічваюць яшчэ больш нажыцца, праліваючы кроў рабочых і сялян. Компартыя арганізуе ва Францыі народны антываенны рух, які расце і шырыцца.

БЕЛЬСКАЯ

На здымку: беластоцкая абласная нарада сялян, якая абмяркоўвала пытанні веснавой сяўбы. (Фота Сапір).

ПА БЕЛАСТОКУ І ОБЛАСЦІ

НОВЫЯ КАЛГАСЫ ЗАБЛУДАЎСКАГА РАЁНА

У Заблудаўскім раёне арганізавана 6 калгасаў. У апошнія дні ў раёне створан новы калгас ім. 17 верасня (вёска Пасанкі). Гэты калгас еднае 24 сялянскія гаспадаркі.

У вёсцы Валілы арганізаван калгас «Вызваленне», які налічвае 45 сялянскіх гаспадарак і 544 гектары зямлі.

БАНКІ

У Беластоцкай абласці адкрыта 11 філіялаў дзяржаўнага банка.

У сувязі з арганізацыяй раёнаў лік аддзяленняў банка значна павялічваецца. У хуткім часе адкрыюцца філіялы банка ў новых раённых цэнтрах: Свіслач, Чыжаў, Заблудава, Крынкі і Кольна.

З 27 сакавіка ў Беластоку пачынаюць сваю работу курсы па падрыхтоўцы крэдытных работнікаў банкаў заходніх абласцей БССР. Курсы разлічаны на 60 чалавек.

АБЛАСНАЯ НАРАДА ЗАГАДЧЫКАЎ РАЙАНА

29 сакавіка абласны аддзел народнай асветы склікае нараду загадчыкаў райана. Нарада абмяркуе пытанні падагульнення трэцяй чвэрці вучэбнага года і намеціць рад мерапрыемстваў па паспяховаму завяршэнню вучэбнага года.

ШКОЛЬНАЕ БУДАЎНІЦТВА

У Беластоку па вуліцы Сасновай яшчэ пры польскай уладзе пачалося будаўніцтва памяшкання для школы, але, акрамя фундамента, тут нічога не пабудавалі.

Наркам––прос БССР на дабудову гэтай школы асігнаваў 250 тысяч рублёў. На працягу 1940 года новы будынак будзе закончан. Яго аб'ём — 6500 кубаметраў.

У хуткім часе Беласток атрымае новы спецыяльны будынак для дзіцячага сада на 100 месц. На будаўніцтва яго адпушчана 250 тысяч рублёў.

КЛОПАТЫ АБ ЗДАРОЎІ ПРАЦОЎНЫХ

У былым Саколкаўскім павеце пры польскай уладзе існавала толькі адна бальніца на 35 ложкаў, якая належала ўласным асобам. Хворыя ў бальніцы знаходзіліся ў адным памяшканні.

Акрамя павятовай бальніцы, у 4-х буйных мястэчках павета працавала тры ўрачы, адзін фельчар і адна акушэрка. За лячэнне была ўстаноўлена высокая плата. Так, урач па зубных хваробах за адзін прыём браў 3—4 злотых.

Па-іншаму пастаўлена медыцынскае абслугоўванне працоўных у Саколцы з устанаўленнем тут савецкай улады. Былая павятовая бальніца значна расшырана і пераабсталявана. Інфекцыйнае, тэрапеўтычнае аддзеленні пераведзены ў другое памяшканне. У асобным памяшканні абсталявана радзільнае аддзяленне на 25 ложкаў. Адкрыты паліклініка з кабінетамі тэрапеўтыі, хірургіі, гінекалогіі, кожна-венерычных хвароб, вочны і кабінет вуха, горла і носа. Створана дзіцячая і жаночая кансультацыі. У чатырох вёсках раёна (Карэйціне, Адольску, Янова і Сакалянцы) адкрыты ўрачэбныя і фельчарскія пункты.

У бягучым годзе намечана адкрыць у вёсках яшчэ 4 ўрачэбныя пункты, 3 бальніцы па 20 ложкаў кожная, 4 радзільных дамы па 5 ложкаў кожны, 2 пункты аховы здароўя і 3 акушэрскіх пункты. Калі раней ва ўсім павеце было толькі 5 урачоў, то зараз у адным раённым цэнтры налічваецца 34 медработнікі.

Федасенка.

ПАМЕДАМЛЕННЕ

27 сакавіка ў 8 гадзін у Доме партасветы (Талстога, 9) адбудзецца лекцыя на тэму: «Аб марксісцка-дыялектычным метадзе».

Лектар ЦК КП(б)Б тав. Гурэвіч.

Гарком КП(б)Б.

Адказны рэдактар Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара — 22 (па камутатару аблвыканкома) і 49 (гарадскі), сакратарыята, партыйнага і савецкага аддзелаў — 23 (па камутатару аблвыканкома), прамысловага, сельскагаспадарчага, культурнага і інфармацыйнага аддзелаў — 17-62 (гарадскі). Тэлефон выдавецтва і аддзела аб'яў — 16-10. Тэлефон друкарні і начной рэдакцыі — 5-21.
Падпіску на газеты прымае «Саюздрук» (Тэлефон 5-14).
Упаўнаважаны аблліта № 431.
1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.